Белорусская военная газета. Во славу Родины

20.04.2018

# «Бібліяноч-2018»

Святлана Баравая

20 красавіка з 19.00 па 23.00 у сталіцы пройдзе «Бібліяноч-2018». На гэты раз у ёй прымуць удзел восем бібліятэк, у тым ліку тры дзіцячыя. Для юных чытачоў «ноч» пачнецца крыху раней — у 18.00 і скончыцца ў 21.00. Кожная бібліятэка падрыхтавала цікавую праграму.




Нацыянальная бібліятэка Беларусі (Незалежнасці, 116) прапануе гасцям праграму пад назвай «Паралелі часу». Будзе гучаць музыка розных эпох, плануюцца выступленні творчых калектываў, майстар-класы па танцах, пляцоўка для аматараў гульні ў шашкі і шахматы, праца творчых майстэрань па бісерапляценню, лозапляценню, вязанню. Будзе працаваць экспазіцыя «Назад у СССР», выстава англамоўнай літаратуры. У жадаючых будзе магчымасць паглядзець першую беларускую кінастужку жахаў, паўдзельнічаць у трэнінгах і не толькі. Будзе працаваць таксама дзіцячая пляцоўка.

Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі (Сурганава, 15) прапануе правесці экскурс у гісторыю. Можна будзе пабачыць цікавыя археалагічныя знаходкі, прыняць удзел у віртуальнай экскурсіі па Мінску стогадовай даўніны, паслухаць навукова-папулярныя лекцыі, выступленні творчых калектываў. Таксама будзе падрыхтавана выстава артэфактаў са збораў музея старажытнабеларускай культуры,

старажытных кніг і рукапісаў. Яшчэ у праграме — кулінарны батл з Марынай Бандаровіч, воркшоп, шляхетны бал і многае іншае. Завяршыцца ноч выступам вулічнага тэатра.

Навуковая бібліятэка БНТУ (Якуба Коласа, 16) запрашае паглядзець на сталіцу нашай рэспублікі — Мінск пад рознымі ракурсамі: Мінск літаратурны — інтэлектуальны — архітэктурны — музычны — сучасны. Адбудуцца аўтарскія чытанні, выступленні музыкаў. Завершыць ноч фаер-шоу.

Фундаментальная бібліятэка БДУ (Незалежнасці, 4) прапануе здзейсніць падарожжа вакол свету за адну ноч. Экскурсаводамі стануць замежныя студэнты БДУ, якія раскажуць пра культуру, літаратуру, музыку сваіх краін. Госці-падарожнікі будуць мець магчымасць паўдзельнічаць у віктарынах, настольных гульнях, пабываць на пляцоўцы «Адукацыя за мяжой. Адукацыя без межаў», паслухаць удзельнікаў «Жывой бібліятэкі», сустрэцца з «Чорным бібліятэкарам»…

Цэнтральная бібліятэка імя Янкі Купалы (Харужай, 16) запрашае наведаць «Гарадскі квартал». Будуць працаваць Дом творчасці, Дом моды, Дом рамёстваў, Дом дружбы, фотаатэлье і дзіцячы садок. Адбудуцца сустрэчы з вядомымі літаратарамі, музыкамі, імпрэза «Шпацыр па таямнічых месцах Мінска», сустрэча з экспертам беларускай кухні Алёнай Мікульчык, квэст «Камароўскія таямніцы» і многае іншае.



Цэнтральная дзіцячая бібліятэка імя М. Астроўскага (Газеты «Праўда», 20а) падрыхтавала для сваіх юных чытачоў праграму «Мільён прыгод». У іх будзе магчымасць пабываць у дэтэктыўным агенцтве, паслухаць нястрашную гісторыю на ноч, паўдзельнічаць у творчых і кулінарных майстар-класах.

Дзіцячая бібліятэка № 16 (Якубоўскага, 32) запрашае паўдзельнічаць у літаратурных віктарынах і конкурсах, стаць гледачамі спектакля тэатра ценяў і не толькі.

Дзіцячая бібліятэка № 3 імя А. Гайдара (Бачылы, 2) запрашае ў «Казачны свет». Гасцей бібліятэкі будуць чакаць літаратурныя гаданні, творчыя майстар-класы, конкурсы, гульні, флэшмобы, перфомансы…